Дзвінскі ўзгорак

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №12 (81)
ЖНІВЕНЬ 2018 ГОДА

МЕМАРЫЯЛ

НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ ТЭРОР

У Міжнародны дзень памяці і ўшанаваньня ахвяраў тэрарызму (21 жніўня) і напярэдадні Міжнароднага дня памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў (23 жніўня) грамадзкія актывісты і жыхары Віцебску аддалі даніну памяці рэпрэсаваным за часамі сталінізму беларусам, забітым ва ўрочышчы Хайсы пад Віцебскам.

У кастрычніку 2014 году пра даваенныя пахаваньні рэпрэсаваных у лесе ля вёскі Хайсы даведалася ўся краіна. Ганебныя падзеі мінулага, пра якія даўно ведалі мясцовыя жыхары, сталі прадметам галоснасьці. З таго часу мінула амаль чатыры гады, але ўлада па-ранейшаму адмаўляецца прызнаваць забітых ахвярамі сталінскага рэжыму.

Адзінае, што застаецца прадстаўнікам грамадзянскай супольнасьці, — рабіць сваю справу па ўшанаваньні памяці нявінна забітых беларусаў. Таму 21 жніўня грамадзкія актывісты і сваякі рэпрэсаваных прыйшлі ў хайсоўскі лес, каб ускласьці кветкі да памінальных крыжоў і нагадаць грамадзтву пра ахвяраў дзяржаўнага тэрору.

Старшыня грамадзянскай ініцыя-тывы «Хайсы» Ян Дзяржаўцаў патлумачыў:

— Сёньня мы прыйшлі сюды, каб ушанаваць іх сьветлую памяць. Ускласьці кветкі. Сваімі ўчынкамі мы дэманструем, што ставімся да рэпрэсаваных ня як да ворагаў народу, а як да бязьвінна пацярпелых пад час сталінскага тэрору. У гэтыя дні мы штогод прыяжджаем сюды. Ва ўрочышчы лякалізаваныя тры месцы, дзе мы паставілі крыжы. Улады адмаўляюцца прызнаваць, што іх папярэднікі расстралялі тут бязьвінных людзей, але ад сьведчаньняў мясцовых жыхароў нікуды не падзецца. Мы іх разумеем: яны — нашчадкі той злачыннай савецкай улады. І як ім прызнацца, што іхныя папярэднікі былі злачынцамі?

Рэдка якую беларускую сям'ю абмінула навала сталінскіх рэпрэсіяў. І дасюль сваякі рэпрэсаваных шукаюць месцы іх магчымых пахаваньняў. Гэтым разам урочышча Хайсы наведаў Анатоль Давыдовіч — унук расстралянага ў Віцебскай турме Антона Давыдовіча 1886 году нараджэньня, жыхара Шумілінскага раёну. Як найстарэйшы ў сям'і, ён палічыў за свой абавязак даведацца пра лёс дзеда, разам зь якім у той дзень, 13 ліпеня 1938 году, расстралялі яшчэ 76 чалавек.

Старшыня грамадзянскай ініцыятывы «Хайсы» Ян Дзяржаўцаў патлумачыў:

— Сёньня мы прыйшлі сюды, каб ушанаваць іх сьветлую памяць. Ускласьці кветкі. Сваімі ўчынкамі мы дэманструем, што ставімся да рэпрэсаваных ня як да ворагаў народу, а як да бязьвінна пацярпелых пад час сталінскага тэрору. У гэтыя дні мы штогод прыяжджаем сюды. Ва ўрочышчы лякалізаваныя тры месцы, дзе мы паставілі крыжы. Улады адмаўляюцца прызнаваць, што іх папярэднікі расстралялі тут бязьвінных людзей, але ад сьведчаньняў мясцовых жыхароў нікуды не падзецца. Мы іх разумеем: яны — нашчадкі той злачыннай савецкай улады. І як ім прызнацца, што іхныя папярэднікі былі злачынцамі?

Рэдка якую беларускую сям'ю абмінула навала сталінскіх рэпрэсіяў. І дасюль сваякі рэпрэсаваных шукаюць месцы іх магчымых пахаваньняў. Гэтым разам урочышча Хайсы наведаў Анатоль Давыдовіч — унук расстралянага ў Віцебскай турме Антона Давыдовіча 1886 году нараджэньня, жыхара Шумілінскага раёну. Як найстарэйшы ў сям'і, ён палічыў за свой абавязак даведацца пра лёс дзеда, разам зь якім у той дзень, 13 ліпеня 1938 году, расстралялі яшчэ 76 чалавек.

Больш як дзьве гадзіны спатрэбілася актывістам, каб абысьці ўсе месцы, ушанаваныя апошнімі гадамі, ускласьці кветкі, прыгадаць гісторыі, звязаныя з канкрэтнымі людзьмі, імёны якіх удалося вярнуць зь нябыту. Ля магілаў — памятныя крыжы, ля крыжоў — кветкі, але ня толькі: дзе-нідзе дасюль валяецца ў лесе абутак рэпрэсаваных і дробныя фрагмэнты чалавечага шкілету, якія не прыбралі вайскоўцы 52-га пошукавага батальёну.

Ян Сьведка

САЦЫЯЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЬЦЬ

ВЯСКОВЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Актывістка з Віцебскага раёна патрабуе палепшыць жыццё жыхароў вёскі Бараўляны.

Актывістка Беларускай хрысціянскай дэмакратыі з Віцебскага раёна Алена Янушкоўская падымае праблемы вяскоўцаў перад уладамі

Актывістка Беларускай хрысціянскай дэмакратыі з Віцебскага раёна Алена Янушкоўская звярнулася ў Мазалаўскі сельскі савет з патрабаваннем палепшыць жыццё жыхароў вёскі Бараўляны.

У прыватнасці, яна патрабуе прыбраць велізарныя валы курынага памёту ад бройлернай птушкафабрыкі «Мазалава — газ», якія ляжаць больш за год на самым пачатку вёскі. Паводле яе, улады замест таго, каб прыбіраць мінулыя кучы гною, толькі падкідваюць новыя.

«У мяне ўзнікае шмат пытанняў да новаабранаму дэпутату Вінакурава Руслана Васільевіча, старшыні Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, які ў няроўнай барацьбе „выйграў" у мяне выбары», — адзначае актывістка.

Таксама яна звяртае ўвагу на дарагавізну тавараў з аўтакрамы, якія «на мяжы пратэрміноўкі або папросту з мінулым тэрмінам прыдатнасці». Хлеб жа з гэтых аўтакрам нават хатнія жывёлы адмаўляюцца есці, а сам ён псуецца за два дні.

Апроч таго, Алена Янушкоўская адзначае, што ў вёсках сельсавету спрэсадсутнічае вулічнае асвятлянне ў вячэрні і начны час. Нагадвае яна і пра тое, што ў выніку меліярацыйных працаў уладаў была забруджаная і перастала струменіць водная крыніца ў вёсцы, ад чаго знікла вада і ў калодзежах.

Звяртае актывістка ўвагу і на тое, што ў канцы вёскі, там дзе раней пачынаўся лес, па «на адным з пакінутых дрэў вісіць таблічка Віцебскага лясгаса, што высечка лесу строга забаронена, і побач з ёй чырвоная пазнака якая азначае, што дрэва падлягае высечцы, астатнія таксама пазначаныя, вось такі парадокс».

Асаблівую заклапочанасць у Алены Янушкоўскай выклікае падача электрычнасці ў вёску. «За два тыдні электрычнасць адключалі тройчы. На 3-4 гадзіны без папярэджання, і гэта не лічачы таго, што вісіць аб'ява аб планавым адключэнні на 2 жніўня. Жыхары наракаюць, што асабліва частыя адключэння ў восеньскі перыяд. Вось так эканомяць на людзях», — адзначыла яна.

Просіць актывістка распавесці і пра будаўніцтва дарогі «ў нікуды». «Якая такая для гэтага вытворчая неабходнасць? Дзе можна даведацца, якія сродкі затрачваюцца на яе будаўніцтва, чаму разбіваецца асфальтаваная дарога праз вёску пры наяўнасці іншых, па якой бясконца праходзяць велікагрузы з пяском і камбайны з нязнятай жаткай, што забаронена законам!? Што перашкаджае жыхарам шумам, брудам, пылам, стварае цяжкасці перасоўвання як аўтааматарам, так і пешаходам, пры гэтым тэхнічна пашкоджваюцца прыдамавыя насаджэнні. Хто будзе аднаўляць дарогу праз Бараўляны?» — пытаецца Алена Янушкоўская ва ўладаў.

«Прашу даць адказ па агучаных вышэй праблемах, патлумачыць, як сельсавет дапамагае грамадзянам дадзенага населенага пункта выжываць, што робіць для нармальнага іх пражывання?» — звяртаецца актывістка.

Ян Сьведка

ІНІЦЫЯТЫВА

КАНТРОЛЬ ЗА АЎТАКРАМАМІ ЎЗМАЦНІЛІ

У Віцебскім раёне ў адказ на зварот Алены Янушкоўскай узмацнілі кантроль працы аўтакрамаў.

Актывістка Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Алена Янушкоўская атрымала адказ з Віцебскага абласнога саюзу спажывецкіх таварыств на свой зварот адносна нізкай якасці працы аўтакрамы ў вёсцы Бараўляны Віцебскага раёна.

У адказе ёй паведамілі, што па выніках звароту быў пашыраны асартымент хлеба і хлебабулачных вырабаў ад ААТ "Віцебскхлебпрам", праведзены маніторынг аўтакрамы, а "камерцыйнай службай УП «Віцебская універсальная база» праца аўтакрамаў узятая пад строгі кантроль".

Таксама Алене Янушкоўскай параілі па ўсіх пытаннях і прапановах у сферы гандлёвага абслугоўвання, а таксама выяўленых парушэннях Правілаў гандлю звяртацца на прамую лінію УП «Віцебская універсальная база» па телефонах 65-73-06, 65-72-01.

bchd.info

ДЭКРЭТ №3

СЬПІСЫ “КАМІСІЙ ПА ДАРМАЕДАХ” СТВОРАНЫ

Сьпісы сябраў камісій “па дармаедах” Першамайскага і Чыгуначнага раёнаў Віцебску апублікаваныя нядаўна на сайце гарвыканкаму.

Пэрсанальныя склады камісій былі зацьверджаныя яшчэ ўвесну 2018 году. У складзе камісій – спрэс дзяржслужбоўцы: супрацоўнікі і кіраўнікі аддзелаў ідэалягічнай працы, адукацыі, спорту і турызму, эканомікі, падатковых інспэкцыяў, ЗАГСаў, разьліковых цэнтраў, аддзелаў ЖКГ, установаў аховы здароўя і РАЎСаў.

Грамадзкія аб’яднаньні ў камісіях прадстаўленыя... першымі сакратарамі раённых камітэтаў БРСМ.

Гэтак, у склад камісіі Чыгуначнага раёну ўваходзіць кіраўнічка аддзелу ідэалягічнай працы Вольга Аляшковіч, галоўныя ўрачы гарадзкіх паліклінік №№ 6 і 7 Алена Пішчык і Людміла Аляксеева, начальнік аддзелу ўнутраных спраў адміністрацыі Аляксей Блахін, першы сакратар Чыгуначнага раённага камітэту БРСМ Карына Пушкарова ды іншыя. У камісіі – 15 чалавек.

Сярод сябраў адпаведнай камісіі пры адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску – намесьнік начальніка аддзелу эканомікі Алена Кавыляева, начальнік аддзелу ЗАГС Алеся Мартынава, раённы ідэоляг Натальля Сокалава, намесьнік начальніка аддзелу ўнутраных спраў раённай адміністрацыі Аляксандар Рыбакоў, загадчык паліклінікі №2 Юры Сьцепаненка, першы сакратар раённага БРСМ Сьвятаслаў Міхайлаў. У складзе Першамайскай камісіі па дармаедах – 17 чалавек, але некаторыя зь іх адзначаныя зорачкамі – “зь іхнай згоды”

Нагадаем, што ў ліпені віцебскі праваабаронца Павал Левінаў прасіў адміністрацыю Першамайскага раёну ўключыць яго ў склад камісіі па спрыяньні занятасьці, але атрымаў адмову. Чыноўнікі спасылаліся на тое, што камісіі ўжо сфармаваныя і зацьверджаныя.

Камэнтуючы адмову, Павал Левінаў казаў, што камісіям нададзеныя занадта шырокія паўнамоцтвы: “З тымі паўнамоцтвамі, якія ім нададзеныя, гэтыя камісіі будуць парушаць правы грамадзян на свабодны выбар прафэсіі, на свабоду распараджацца сваім часам, будуць умешвацца, у тым ліку, і ў прыватнае жыцьцё грамадзян”.

На сайце Віцебскага гарвыканкаму паведамляецца, што “сьпіс грамадзян, не занятых у эканоміцы”, будзе сфармаваны да 1 сьнежня 2018 году.

Але, як паведаміла 8 жніўня дзяржаўнае выданьне “Витебские вести”, падчас працоўнай нарады старшыня абласнога Савету дэпутатаў Уладзімер Цярэнцьеў “даў даручэньне” сфармаваць сьпісы да 1 верасьня.

Вельмі паказальна пры гэтым, што афіцыйная абласная газэта ўжо больш не карыстаецца пэрыфразамі кшталту “не занятыя ў эканоміцы”, а наўпрост называе ў загалоўку такіх людзей “тунеядцами”.

“Уключаныя ў сьпіс працаздольныя грамадзяне, не занятыя ў эканоміцы, будуць аплачваць па тарыфах, якія забясьпечваюць поўнае пакрыцьцё эканамічна абгрунтаваных выдаткаў на аказаньне паслугаў, гарачае водазабесьпячэньне ад 1 студзеня 2019 году, газазабесьпячэньне пры наяўнасьці індывідуальных газавых ацяпляльных прыладаў і цеплазабесьпячэньне – ад 1 кастрычніка 2019 году”, – нагадваюць камісіі.

Зьміцер Міраш

НАША ЖЫЦЦЕ

ВОДАПРАВОДУ Ў СУЙКАВЕ НЯ БУДЗЕ

Актывістка Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Алена Янушкоўская атрымала адказ ад намесніка старшыні Віцебскага райвыканкама Аляксея Героева на свой зварот адносна сітуацыі ў вёсках Заронаўскага сельсавету.

З адказу вынікае, што Галоўнае ўпраўленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкаму адмовіла ў вылучэнні сродкаў на будаўніцтва водаправоду ў вёсцы Суйкава, а “іншыя крыніцы для працягу прац у 2018 годзе ў дадзены момант адсутнічаюць”.

Водазабеспячэнне ж іншых вёсак, заявілі ў райвыканкаме, “адбываецца ў аб’ёме, дастатковым для жыццядзейнасці насельніцтва, дзяржаўныя сацыяльныя стандарты выконваюцца”.

Што тычыцца іншых пытанняў, то, напрыклад, стан праблемных дамоў задавальняючы, барацьба з баршчэўнікам працягваецца, культурнае жыццё квітнее, вулічнае асвятленне працуе як след і пісьмовых скаргаў жыхароў сельсавету “не паступала”.

Не скардзіліся вяскоўцы і ў Галоўнае ўпраўленне гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкаму на працу вясковых крамаў, дарагавізну прадуктаў і іх не высокую якасць, заявілі ўжо ва ўпраўленні.

bchd.info

ПАЛІТЫЧНЫ ЦІСК

ЗАТРЫАНЫ АКТЫВІСТКІ БХД

Затрыманьне адбылося ў другой палове дня 8 жніўня каля вёскі Бараўляны, калі група актывістаў вярталася дадому ў Віцебск пасьля варты каля рэстарацыі «Поедем поедим» побач з Курапатамі. Алену Янушкоўскую і Ірыну Захараву адвезьлі ў бараўлянскі пастарунак.

На абедзьвюх склалі пратаколы паводле артыкулу 23.34КаАП(парушэньнепарадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

Сьведка затрыманьня Аляксандар Квіліс апавёў, што дарогай з Курапатаў за іхнай машынай сачылі, потым яе спынілі супрацоўнікі ДАІ і загадалі чакаць міліцыю.

Тацяна Севярынец, чацьвёртая ўдзельніца «віцебскага дэсанту», сышла з Курапатаў раней.

«Падчас нашага дзяжурства ніякіх асаблівых інцыдэнтаў не было — ні боек, ні сварак. Адно што Алена ўсё здымала на відэакамэру, і гэта вельмі не падабалася ахоўнікам рэстарацыі. Магчыма, гэта галоўная прычына затрыманьня», — мяркуе Тацяна Севярынец.

Алену Янушкоўскую і Ірыну Захараву пратрымалі ў пастарунку тры гадзіны і паведамілі, што на працягу 10 сутак ім поштай дашлюць копіі пратаколаў. Гэтыя пратаколы спадарыні Захарава і Янушкоўская адмовіліся падпісаць, бо ня лічаць сябе вінаватымі.

Міліцыянты сказалі таксама, што судзіць іх будуць у Віцебску — па месцы жыхарства.

За чатырма жыхарамі Віцебску (Алена Янушкоўская, Ірына Захарава, Тацяна Севярынец, Аляксандар Квіліс) міліцыя сачыла 8 жніўня з самай раніцы. Па дарозе ў Менск іх тройчы затрымлівалі. У Лагойску і Лепелі правяралі дакумэнты. А ў Бешанковічах пасьля амаль што дзьвюхгадзіннага разбору на кіроўцу (спадара Квіліса) склалі пратакол за перавышэньне хуткасьці.

Радыё Свабода

ЗДАРЭННЕ

ПРОВОКАЦИЯ ИЛИ ИСПОРЧЕННЫЙ ТЕЛЕФОН?

«Трагедия произошла во мгновение ока, практически на глазах тёти мальчика, которая в это время во дворе собирала яблоки. Благодаря же тёте ребёнка, его и удалось спасти, она буквально вырвала малыша из зубов агрессивных разъярённых собак, фактически в самый последний момент, когда окровавленный малыш уже стал белеть и задыхаться. Мальчик получил серьезные ранения — рваные раны в области груди, а так же сильно покусана ножка ребёнка».

Страшная история нападения на маленького мальчика стаи бездомных собак была описана не так давно в социальной сети facebook. Произошёл инцидент 14 августа в деревне Верховье Витебского района. Для того, чтобы увидеть агрессивных животных и принять решение по их обезвреживанию, в деревню с проверкой отправились представители Железнодорожного РОВД города Витебска. Они и установили все обстоятельства нападения.

Такса вместо своры

Как рассказал Витебскому зелёному порталу официальный представитель УВД города Витебска, обстоятельства, описанные автором поста оказались несколько преувеличенными.

В день трагедии ребёнок 2013 года рождения гулял на улице. Родная тётя мальчика, услышав его крик, выбежала за ворота и увидела, что соседка палкой отгоняет от малыша собаку, а на ноге ребёнка видна кровь. Оказалось, на ребёнка напала одна из двух соседских такс. При этом одну собаку соседка держала на поводке, а другая ходила по улице совершенно свободно. Она-то и укусила мальчика.

Сразу после укуса ребёнка отвезли в травматологическое отделение, где врачи поставили диагноз: рваная кусаная рана левой голени. Мальчик был госпитализирован в хирургическое отделение, но его жизни ничего не угрожает, таксы оказались домашними, привитыми от бешенства. Хотя рану назвать совсем пустяковой нельзя: всё-таки оставила её охотничья собака.

Все собаки кусаются

Почему домашняя такса напала на ребёнка? Как стоит вести себя, чтобы подобные случаи не повторялись? Ответить на эти вопросы и прокомментировать ситуацию мы попросили кинолога Татьяну Лобкову:

— Такса — это охотничья собака. Несмотря на то, что она домашняя, она может проявлять агрессию, — пояснила специалист. — Никто не знает, о чём подумало животное в данный конкретный момент. Скорее всего, таксе показалось, что ей угрожает какая-то опасность. Сейчас трудно сказать, как это произошло, но все собаки кусаются, и коты кусаются, и петухи клюются. Поэтому родители, если они отпускают детей гулять без присмотра, должны объяснять, что с животными надо вести себя аккуратно. Дети должны понимать, что это — не пушистая игрушка, которая не сделает тебе ничего плохого. Это такое же живое существо, готовое постоять за себя.

Татьяна считает, что вины собаки в происшедшем нет. А вот хозяйка должна отвечать за случившееся: нельзя выпускать собаку на прогулку без привязи, какой бы добродушной она не казалась.

Так была ли свора?

Казалось бы, все точки над «і» расставлены: ребёнок пострадал из-за халатности владелицы собак и потому, что, гуляя один, не был научен держаться от чужих животных подальше.

Остаётся вопрос, кто и зачем рассказал автору поста такую страшную кровавую историю с шокирующими подробностями о рваных ранах на груди и побелевшем от потери крови ребёнке? Горячая новость тут же разлетелась по городским интернет-сайтам, вызвала жаркие споры сторонников и противников отстрела безнадзорных животных, а кого-то, возможно, подтолкнула к понятным действиям.

Вполне возможно, что в Верховье действительно есть безнадзорные животные. Наверняка, они сбиваются в стаю, которая может быть опасной для людей. Тогда рассказанный журналисту страшный случай становится провокацией, позволяющий решить проблему бездомных животных Верховья не гуманно, но с чистой совестью: не вызывать отлов, а действовать. Вот только стоит ли, пусть и косвенно, плодить новые отряды догхантеров в нашем и без того не самом здоровом обществе?

Вікторыя Дашкевіч

АБ’ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты “Дзвінскі Ўзгорак” паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэдэфануйце.

Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты “Дзвінскі Ўзгорак“.

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

«ЖЭСТАЧАЙШАЕ ЎЖЭСТАЧЭННЕ»

Другая палова 2017 года прайшла ў Беларусі пад знакам разняволення дзелавой ініцыятывы. У поўнай адпаведнасці з даўно ўсталяванай адміністрацыйнай традыцыяй, добрыя намеры былі афармленыя ў выглядзе пакета дакументаў — двух дэкрэтаў і сямі ўказаў адзінага палітыка (АП).



На двары жнівень. Самы час падвесці першыя вынікі разняволення, але арганізатары кампаніі рабіць гэта не спяшаюцца. Зразумець іх нескладана. Не да тага ім цяпер. Яны занятыя распрацоўкай чарговых дэкрэтаў і ўказаў. Больш адказнай працы ў рамках беларускай мадэлі няма, дый не прадбачыцца. Да яе допускаюцца толькі высокакваліфікаваныя спецыялісты, адданыя дзяржаве, здольныя на ўзроўні інтуіцыі прадбачыць і апярэджваць чарговыя зігзагі генеральнай лініі. Мінулым яны не жывуць, бо на яго аналіз не застаецца ні часу, ні сіл. Вось і давялося мне ўзяць ініцыятыву ва ўласныя рукі.

Працей за ўсё падвесці вынікі з дапамогай пошукавіка «самай саліднай газеты» краіны. Вынікі пошуку адлюстраваны ў табліцы. Яны апынуліся чаканымі. Калі за 2017 год у «Советской Белоруссии» было апублікавана 59 артыкулаў, якія змяшчаюць фразеалагізм «разняволенне дзелавой ініцыятывы», дык за першую палову 2018-га — толькі 7! Прычым, чатыры з сямі — у студзені. Апошні ж раз артыкул з такім папулярным летась фразеалагізмам быў апублікаваны 26 красавіка.

Вікіпедыя вызначае моду як сукупнасць звычак, каштоўнасцяў і густаў, прынятых у пэўным асяроддзі ў пэўны час. У канцы мінулага года на верхніх паверхах уладнай вертыкалі ў модзе былі размовы пра разняволенне дзелавой ініцыятывы. Тон, натуральна, задаваў АП. Сваё бачанне праблемы ён, у прыватнасці, выклаў 11 красавіка падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць: «У бліжэйшы час мы прымем рэвалюцыйныя рашэнні па прадпрымальніцтву, бізнесу — па разняволенні бізнесу. <...> Прыйшоў — заяву пакінуў, што хочаш займацца гэтай справай, у падатковай зарэгістраваўся ды пайшоў працаваць. Пажарныя, санстанцыя — усё да мінімуму будзе скарочана».

Рэвалюцыйныя рашэнні былі прынятыя, а як наконт рэвалюцыйных вынікаў? Колькасць суб'ектаў гаспадарання на 1 ліпеня ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася ў Беларусі на 1,6%, а колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў скарацілася на 0,3%. Ці можна такую статыстыку лічыць рэвалюцыйнай? Не ўпэўнены, аднак і адкрыта правальнай назваць яе нельга.

Святое месца пустым не бывае

«Мода не проста робіць жанчын прыгожымі, яна дае ім упэўненасць у сабе», — сцвярджае французскі мадэльер Іў Сэн-Ларан. А як наконт палітыкаў? Палітыка — царства мужчын, тым не менш прытрымліванне палітычнай моды таксама спрыяе павышэнню ўпэўненасці ў сабе прадстаўнікоў моцнага полу (у выпадку Беларусі гаворку пра палітыка варта весці ў адзіночным ліку).

Выход з моды публічных размоў на тэму «разняволення дзелавой актыўнасці» — працэс натуральны. Палохацца яго не варта, бо ў палітыцы святое месца пустым не бывае. Але што прыйдзе на змену «разняволенню»? Тут могуць быць розныя варыянты. Не выключана, што падказку мы можам знайсці ў прэс-рэлізе «Нарады па пытаннях сацыяльна-прававых гарантый дзяржслужачых і павышэння прэстыжу дзяржслужбы» ад 26 ліпеня.

Ключавыя словы прэс-рэлізу — назоўнік «ўжэстачэнне» і прыметнік «жэстачайшы». Абмяжуюся адным прыкладам: «Но люди и общество должны видеть, что президент тем самым предъявляет жесточайшие требования к госслужащим, а за это им полагается это, это и это. За нарушения уходишь с должности, идешь в тюрьму. Люди должны это все понимать. Поэтому сначала требования к госслужащему, которые он должен жесточайшим образом соблюдать и выполнять, а затем коврижки», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Калі меркаваць па дынаміцы артыкулаў у «Советской Белоруссии», якія змяшчаюць слова «жэстачайшы», слова гэта варта прызнаць неалагізмам, які сігналізуе пра чарговую змену адміністрацыйнага вектара. На працягу шасці гадоў артыкулы з яго згадваннем выходзілі з-пад «залатых пёраў» беларускай журналістыкі ў сярэднім не часцей чым тры разы на год. Мода на жорсткасць (галоўным чынам гаворка ідзе пра «жэстачайшыя» патрабаванні, «жэстачайшую» адказнасць і «жэстачайшы» парадак) стартавала ў 2016 годзе і з таго часу разгортваецца па нарастаючай.

Як вядома, у схільнасці да навукова-тэарэтычнай рэфлексіі АП яшчэ ні разу абвінавачаны не быў. Усе лёсавызначальныя для краіны і грамадства рашэнні ён прымае «ідучы ад жыцця», пра што сам неаднаразова і заяўляў. Якія ж на гэты раз прычыны прымусілі яго перайсці ад разняволення дзелавой ініцыятывы да ўзмацнення жорсткасці патрабаванняў, што прад'яўляюцца чыноўнікам?

«Тебя посодют, а ты не воруй!»

…Савецкая мадэль у максімальнай ступені была пабудаваная паводле раздатачнага прынцыпу. Яе рынак функцыянаваў выключна з дадаваннем прыметніка «чорны». Ён паразітаваў на афіцыйным квазірынку і быў яго неад'емным элементам. Такая вось «салодкая парачка»!

Як тут ні прыгадаць героя Андрэя Міронава з кінафільма «Сцеражыся аўтамабіля», які гандляваў з-пад прылаўка імпартнай радыёапаратурай. Знакамітае абвінавачванне цесця: «А ты не крадзі!» варта прызнаць юрыдычна недакладным. Герой Міронава не краў. Ён спекуляваў, што не адмяняла актуальнасці яго бліжэйшай жыццёвай перспектывы — «Тебя посодют».

Перабудова, у тэрміналогіі Бяссонавай, — гэта пераход ад адміністрацыйнай раздачы савецкага ўзору да раздачы ліберальнай. Першае, што пры гэтым кідаецца ў вочы, — гэта пагалоўнае ўкараненне індывідуальных кантрактаў у сферы рэгулявання працоўных адносін. Барацьбу з дармаедамі варта разглядаць у якасці фінальнага акорда на шляху пераходу ад прыватнай працы да службовай.

Службовы кантракт — гэта не прыватны кантракт паміж двума рынкавымі суб'ектамі, дзе яны вызначаюць усе ўмовы самі. Службовы кантракт фіксуе бяспраўнасць прыватнай асобы, а калі апошняя ўсё ж здолее вырвацца з-пад навязаных працоўных адносін, то дзяржава адмаўляецца ад сваіх канстытуцыйных абавязацельстваў перад ёй.

Пераход да ліберальнай раздачы суправаджаўся адмовай ад жорсткага дырэктыўнага планавання зверху, калі кожнаму прадпісвалася, што і як рабіць на сваім працоўным месцы. У выніку самастойнасць ніжніх звёнаў істотна ўзрасла, але пры гэтым адэкватнага зніжэння жадання «паруліць» на верхніх кіраўнічых узроўнях не сфармавалася. «Самая галоўная складанасць гаспадарання, — адзначае Бяссонава, — гэта забяспечыць самастойнасць у рамках адзіных правілаў. Інакш кожны пачынае аптымізаваць лакальна пад сябе»….

Маштабныя праекты ў Беларусі — гэта за рэдкім выключэннем праекты дзяржаўныя. Таму адзіным суб'ектам, які адказвае за іх распрацоўку і рэалізацыю, быў і застаецца чыноўнік. Прыняты ў канцы 2017 года пакет дакументаў, накіраваны на разняволенне дзелавой ініцыятывы, да іх дачынення не мае. Тут іншая логіка — логіка жорсткага кантролю. Але яна адмаўляецца працаваць, калі ад чыноўніка патрабуецца не выканаў-часць, а здольнасць «вызначаць стратэгічныя задачы і правільна ацэньваць наступствы рашэнняў, што прымаюцца».

Да чаго гэта прыводзіць на практыцы, наглядна прадэманстраваў прыклад з беларускай АЭС. Будаўніцтва першага энергаблока выйшла на завяршальную стадыю, а АП, паводле яго ўласнага прызнання, «да гэтага часу выразна ніхто не далажыў, як станцыя будзе ўбудаваная ў эканоміку краіны».

Сяргей Нікалюк
"Новы час"

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ

ДВОЙКА ЗЬ МІНУСАМ…

Паездка Аляксандра Лукашэнкі ў Аршанскі раён засьведчыла правал чарговага грандыёзнага мадэрнізацыйнага праекту.

А як прыгожа ўсё пачыналася!

21 красавіка 2017 году, выступаючы са штогадовым пасланьнем парлямэнту і беларускаму народу, Лукашэнка даручыў «падняць з руін і попелу ў бліжэйшы час» населеныя пункты Барань, Балбасава і Воршу. Ураду было загадана паказаць, «як у кароткі прамежак часу трэба развіваць буйны і вельмі складаны рэгіён», зрабіць Аршанскі раён узорна-паказальным. Каб затым на гэтым прыкладзе распрацаваць плян развіцьця іншых тэрыторый Беларусі. Такім чынам, Аршанскі раён павінен быў стаць лякаматывам рэгіянальнага развіцьця краіны.

Чаму менавіта Аршанскі раён быў абраны ў гэтай якасьці, Аляксандар Лукашэнка патлумачыў даволі дзіўна:

«Гэта не таму, што я там нарадзіўся. А таму, што там разьмешчана буйная ўстанова, якая ў народзе называецца „турма". І палова людзей, вызваляючыся, застаецца там. Вы разумееце, нікога не хачу пакрыўдзіць, што гэта за людзі. І як там „проста" працаваць».

То бок менавіта для тых, хто выйшаў з турмы, кіраўнік дзяржавы даручыў стварыць лепшыя ўмовы, чым для ўсіх астатніх грамадзян. Такі ў Беларусі прывілеяваны слой насельніцтва, такія прыярытэты.

Ураду было даручана цягам году (запомнім гэта!) істотна палепшыць сытуацыю ў Аршанскім раёне, а да 2020 году ўсе стратныя прадпрыемствы павінны правесьці мадэрнізацыю, стварыць новыя працоўныя месцы, наладзіць эфэктыўную працу і павысіць заробкі. Выконваючы загад, урад у траўні 2017 году правёў адмысловае паседжаньне па гэтым пытаньні, былі вызначаны падыходы па кожным прадпрыемстве. У чэрвені таго ж году ўрадам быў прыняты комплексны плян першачарговых мер па развіцьці Аршанскага раёну да 2020 году. Дзеля гэтага былі выдзелены немалыя грошы «ў межах ліміту дырэктыўнага крэдытаваньня, устаноўленага для Банку развіцьця», ільготныя працэнты і іншае. Паводле кіраўніка Віцебскай вобласьці Мікалая Шарстнёва, сума датацый дзесяці раёнаў вобласьці роўная суме датацый, якія атрымлівае Аршанскі раён. Лукашэнка паабяцаў рэгулярна асабіста кантраляваць рэалізацыю гэтага праекту.

І вось праз год, 13 жніўня, кіраўнік Беларусі прыехаў у Воршу, каб паглядзець, як гэты населены пункт паводле яго мудрага рашэньня ператвараецца ў горад-сад. Наведаў чатыры прадпрыемствы. І што пабачыў?

Высьветлілася, што практычна ўсе прадпрыемствы раёну — праблемныя.

«Усё было зроблена саматужна, на скорую руку, а значыць, няякасна... Ня зроблена практычна нічога... Пакуль гэта ідыёцкае стаўленьне да майго даручэньня», — заявіў Лукашэнка на месцы.

І ацаніў працу на двойку зь мінусам. На нарадзе 14 жніўня старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Леанід Анфімаў канстатаваў, што шэраг паказчыкаў у Аршанскім раёне нават ніжэйшыя, чым сярэднеабласныя.

«Ня любіце вы людзей, ня

(працяг на стар. 4)

САЦЫЯЛЬНАЯ МАДЭЛЬ

(пачатак на стар. №3)
любіце вы завод. Калі ўжо робіце тут нейкую паказуху, зрабіце бардзюр, але навошта ў траву класьці асфальт? Гэта што, культура? Вось за гэта чыноўнікаў і ненавідзіць часам народ — за вашы безалабернасьць і бязладзьдзе», — абурыўся ён.

Далей яшчэ цікавей: «Хіба гэта працоўныя месцы?! Вязьніца нейкая! Катаржныя людзі працуюць за 200 даляраў у месяц!» — абурыўся Лукашэнка ўмовамі працы работнікаў.

Што ж рабіць? Беларускі лідэр хутка знайшоў выйсьце: «Міністра сюды накіруем да цябе працаваць. У яго выбар адзін: ці турма, ці сюды». Гаворка ідзе пра міністра прамысловасьці Віталя Ваўка.

Лукашэнка даў даручэньне паставіць на гэты завод станкі з суседняга заводу «Чырвоны барацьбіт». Без кіраўніка дзяржавы дырэктары заводаў да гэтага дадумацца не маглі.

Сытуацыя на іншых прадпрыемствах, якія наведаў Лукашэнка, ня лепшая. Прыехаўшы ў ААТ «Тэхніка сувязі» ў горадзе Барань, ён заявіў: «Я бачу, вы наагул ня думалі над рашэньнем той задачы, якая была пастаўлена».

А потым здарылася ўвогуле нespadзяванка, якую кіраўнік дзяржавы пракамэнтаваў так:

«Вы не плянавалі, што я зайду ў ваш „туалет“... дзе ніхто ніколі не прыбіраў» (?!).

Вось такі атрымаўся ўзорна-паказальны раён. Хочацца сказаць, паказушны. З асфальтам, які кладуць у траву, з туалетам, які ніхто ніколі не прыбірае. Але ў гэтым ёсьць вялікі сымбалізм. Гэта і ёсьць сапраўдны ўзор беларускай правіцельнасці пэрыяду кіраваньня нязьменнага прэзыдэнта. Вынік функцыянаваньня беларускай сацыяльнай мадэлі імя Лукашэнкі. Перафразуючы словы вядомага анэкдоту, хочацца сказаць: гэта Радзіма, Аляксандар Рыгоравіч!

Меркаваньні, выказаныя ў блогах, перадаюць погляды саміх аўтараў і не абавязкова адлюстроўваюць пазыцыю рэдакцыі.

Валер Карбалевіч
"Радыё Свабода"

СПРАВА КОРЖЫЧА

«ЗАСТАВИЛИ ОТЖИМАТЬСЯ В ПРОТИВОГАЗАХ»…

На суде по делу о гибели рядового в Печах рассказали, как обращались с солдатами.

На скамье подсудимых трое сержантов — Евгений Барановский, Егор Скуратович и Антон Важевич. Им предъявлено обвинение по ч. 3 ст. 455 УК (Злоупотребление властью, повлекшее тяжкие последствия), ч.ч. 1, 2 ст. 430 (Получение взятки), ч. 1 ст. 205 (Кража). Военнослужащим грозит до 12 лет лишения свободы.

В первый день суда прокурор зачитал обвинение. Некоторые моменты просто шокируют.

По версии следствия, Барановский неоднократно получал взятки от солдат. Мобильники, которые он замечал у солдат, Барановский оставлял себе. Никому об этом не докладывал. «Молодые» вынуждены были просить у него свои мобильные «в аренду». За один сеанс связи Барановскому платили 30-40 рублей, пишет «Наша Ніва».

Александр Коржич также обращался к сержанту и также вынужден был платить.

Платили солдаты сержанту и за возможность сходить в магазин. Здесь налог брался товарами: растворимый кофе «3 в 1», вафли, сигареты, макароны «Роллтон» ... Все это, согласно следствию, шло сержанту Барановскому.

Всего Коржич купил продукты для Барановского на сумму 54 рубля, сообщает TUT.BY. Другие солдаты тоже ходили в магазин для сержанта, покупали ему булочки, семечки, чипсы, шаурму, пиццу. Всего он получил взяток на сумму в 314 рублей 85 копеек.

Одними деньгами не ограничивались. Барановский с еще одним сержантом, Скуратовичем, поднимали солдат и заставляли отжиматься. Таким образом «молодых» наказывали за недостаточно быстрое построение, плохо пришиты воротнички. Иногда парней поднимали и ночью с постели.

Во время отжиманий их нередко заставляли замирать на полусогнутых руках. Однажды за разговоры после команды «отбой» солдат подняли с постели и заставили отжиматься в противогазах. Один из них сначала отказался, но, получив несколько ударов от сержанта, все же начал отжиматься.

А за то, что подчиненный курил в туалете, заставил рядового вычистить унитаз, только перед этим Барановский вымазал его обувным кремом.

Сержант Егор Скуратович также, по версии следствия, брал с солдат продукты за разрешение сходить в магазин, брал деньги. Сдавал в аренду «изъяты» мобильники, заставлял «молодых» отжиматься.

Летом 2017 года Александр Коржич обратился к Барановскому с просьбой оградить его от нарядов и выполнения незаконных требований других сержантов. Сразу он передал обвиняемому 30 рублей, а затем передал еще 35 рублей, потому что Барановский был недоволен тем, что Коржич попал в стационар.

Систематические унижения, отбирания продуктов, формирование мнения о вседозволенности, беззаконности и коррумпированности побудило Коржича совершить акт самоубийства. Александра Коржича сержант бил шесть раз, нанося по 2–3 удара. По версии следствия, все это и привело к самоубийству Александра Коржича.

— Систематические унижения, отбирания продуктов, формирование мнения о вседозволенности, беззаконности и коррумпированности побудило Коржича совершить акт самоубийства. 27 сентября после выписки из госпиталя Коржич проследовал в подвальное помещение, где и повесился, — зачитал обвинение прокурор….

(скарочана)

"Салідарнасць"

СВАБОДА СЛОВА

ПОГРОМ НЕЗАВИСИМЫХ СМИ

Главное событие начала августа — «дело БелТА». Под предлогом несанкционированного подключения к информации главного информационного ресурса государства Следственный комитет провел обыски в офисе интернет-портала TUT.BY и информационного агентства БелаПАН, других ресурсов, в квартирах журналистов. Возбуждено уголовное дело, были задержаны на 1—3 суток больше десятка работников СМИ.

Сам факт воровства информации у БелТА выглядит как дурной анекдот. Зайдите ради интереса на сайт этого агентства (http://www.belta.by). Через две минуты у вас скулы сведет от скуки. Тем не менее, на этом основании власти начали облаву на главные независимые СМИ страны.

Очень сомнительны юридические основания этого дела. Статья 349 Уголовного кодекса Беларуси, которую вменяют журналистам, предполагает «несанкционированный доступ к информации... сопровождающийся нарушением системы защиты». Ее применяют в отношении хакеров, взламывающих компьютерные системы. В данном случае, судя по обнародованной информации, обвиняемые журналисты входили на сайт БелТА по паролям, полученным от коллег, работающих в государственных СМИ…

Операция имеет активное информационное сопровождение. В государственных медиа развернута кампания против независимых СМИ. Следственный комитет подробно описывает все обвинения, в то же время подозреваемые журналисты дали подписку о неразглашении тайны следствия. То есть выслушать версию обвиняемой стороны мы не можем.

Таким образом, не вызывает сомнений, что вся эта кампания носит политический характер, хоть и происходит под видом наказания за киберпреступление. Так ведь и лидеров профсоюза РЭП Геннадия Федынича и Игоря Комлика также судят не за профсоюзную деятельность, а за неуплату налогов. Такое нынче время на дворе.

Важно обратить внимание, что нападение произошло на два крупнейших независимых информационных ресурса. Интернет-портал TUT.BY имеет самое большое в Беларуси количество пользователей. БелаПАН — единственное в стране негосударственное информационное агентство. Такого масштаба репрессий против медиа у нас давно не было.

Каковы причины этого неожиданного «наезда» на независимые СМИ?

С начала года власти не скрывают своей обеспокоенности тем, что они потеряли контроль над белорусским информационным пространством. Государственные СМИ проиграли независимым медиа политическую борьбу в интернете. Белорусское телевидение не выдерживает конкуренции с российскими телеканалами. Поэтому предпринимаются лихорадочные меры, чтобы эту неприятную ситуацию поменять. Зимой Александр Лукашенко поменял трех редакторов главных государственных СМИ. Заблокировали «Хартию». Приняли новый, более жесткий закон о СМИ. Начали преследование гендиректора информационного агентства БелаПАН Алеся Липая. Генеральный прокурор Беларуси Александр Канюк анонсировал введение ответственности за ложную информацию в интернете. И вот новый виток репрессий против «нечестных» журналистов.

Поскольку власти не в состоянии создать эффективную альтернативу независимым СМИ, то они применяют самый простой, привычный и понятный для них способ борьбы с политическими оппонентами — заткнуть им рот. Нужно запугать не только сами негосударственные информационные ресурсы, но и комментаторов в социальных сетях, чтобы все они немного угомонились, спрятались, включили самоцензуру.

В среде политизированной публики доминирует версия, что непосредственным поводом для этой облавы стала фейковая информация о здоровье А. Лукашенко. А это уже покушение на святое. Личная жизнь, здоровье первой особы в Беларуси — сфера сакральная. Сработал политический инстинкт. И хоть бороться с медиа, с журналистами в эпоху интернета — неразумно, нерационально, но здесь многие вещи происходят инстинктивно, на уровне рефлекса. И тут использовали удобный повод: воровали информацию БелТА. Ага, попался, который кусался!

Каковы политические последствия этого погрома? Прежде всего, в очередной раз включен стоп-сигнал процессу условной либерализации. Причем, судя по всему, это не отдельный шаг, а устоявшаяся тенденция. «Дело профсоюза РЕП», «дело Алеся Липая», теперь вот «дело БелТА». Кто следующий? В СМИ появился термин: «азербайджанизация» Беларуси. (В Азербайджане практически придушили независимые СМИ.)

В экспертном сообществе обращают внимание на то, что репрессии против независимых СМИ происходят в момент обострения политического противостояния между Минском и Москвой. А оно, как обычно, сопровождается очередным всплеском информационной войны. Но проблема в том, что белорусские государственные СМИ проигрывают российским медиа, прежде всего, федеральным телеканалам.

Однако политическое руководство Беларуси считает угрозу своей власти со стороны независимых СМИ большей, чем опасность доминирования российских медиа. Отсюда и соответствующие ответные действия.

Репрессии против журналистов вызвали значительный международный резонанс. О событиях в Беларуси сообщили мировые СМИ, обеспокоенность выразили Совет Европы, Верховный представитель ЕС по вопросам внешней политики и политике безопасности Федерика Могерини, посольство США в Минске и т. д. То есть скандал вышел на международный уровень. И он, мягко говоря, не способствовал улучшению отношений между Беларусью и Западом.

То есть одновременно Минск вступил в период напряженных отношений и с Россией, и со странами ЕС и США. Что просто неразумно. Но так бывает, когда инстинкты вытесняют и подменяют политическую целесообразность.

Валерий Карбалевич

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч
Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.
Падпісана да друку 30.08.2018 у 15.40
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.